ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 04 2014 г.

Мы — такія!

# ГІСТОРЫЯ МАЁЙ СЯМ'І

## (з успамінаў бабулі Ванды Пятроўны)

**Да 1939 года на маёй малой радзіме была польская ўлада. Затым уклад жыцця ўсіх людзей, якіх і цяпер называюць заходнікамі, кардынальна змяніўся. Сведкам таго пераломнага часу і далейшых падзей была мая бабуля, якая за 83 гады пабачыла столькі, што тое пабачанае і перажытае літаральна просіцца на старонкі рамана, які, магчыма, напішацца некалі мною. Паслухаем Ванду Пятроўну...**

«Памятаю сябе з пяцігадовага ўзросту. 1935 год. Мы жылі на хутары каля Сваятычаў, што непадалёку ад мястэчка Ляхавічы. Мелі восем гектараў зямлі, якую купілі ў нямецкага графа Генрыха Плятэра, уладальніка маёнтка ў Сваятычах. У сям'і было сямёра дзяцей: чатыры дзяўчынкі і трое хлопчыкаў. Размаўлялі толькі па-польску, як усе ў вёсцы, і лічыліся палякамі. Я была самая старэйшая. Выхоўвалі нас бацька з маці. Бацька, Пётр Іосіфавіч Ціуля, быў вядомым у наваколлі чалавекам. Працаваў ён рымарам (майстрам па вырабе вупражы для коней) у пана Чарноцкага з маёнтка Нача. Усё жыццё бацька пражыў, можна сказаць, не дома. Да нас прыязджаў толькі ў суботу і нядзелю, каб дапамагчы па гаспадарцы і схадзіць усёй сям'ёй у касцёл, дзе вёў імшу ксёндз Петрашэвіч. Каб апрацаваць зямлю, сабраць ураджай, бацька наймаў работнікаў, справядліва і своечасова разлічваючыся з імі за працу. Ён быў працавітым чалавекам: спаў па тры-чатыры гадзіны, каб зарабіць для сям'і грошай, набыць яшчэ больш зямлі і паставіць на ногі дзяцей. Маці, Маргарыта Адамаўна Паўлік, займалася нашым выхаваннем. Яна сама пякла хлеб, варыла мыла, усю ноч магла ткаць ручнікі. Гаспадарка ў нас была вельмі вялікая: два кані, дзве каровы, сем авечак, пятнаццаць гусей, трыццаць курэй, трыццаць шэсць вулляў пчол. Ужо ў дзевяць гадоў кожнага з маіх равеснікаў вучылі жаць і сушыць збажыну. Паколькі я была самая старэйшая ў сям'і, то кожную раніцу прачыналася ў чатыры гадзіны і ішла на поле пасвіць дзвюх кароў і адначасова вучыла ўрокі.

У 1938 годзе, маючы за плячамі восем гадоў (у польскай школе навучанне пачыналася з 8 гадоў), я пайшла ў першы клас Сваятыцкай школы, якая знаходзілася за тры кіламетры ад нас. Хадзілі пешшу. Партфель і боты нам рабіў бацька, а ўсё адзенне шыла маці. У першым класе навучылася чытаць, пісаць па-польску, бо беларускай мовай не карысталіся. На перапынках забараняліся нават некалькі слоў вымавіць па-беларуску, і ўсе вучні падпарадкоўваліся патрабаванням польскіх настаўнікаў, бо баяліся быць бітымі лінейкай ці ўвогуле — быць выключанымі са школы. Да гэтага часу памятаю боль у далоні, па якой настаўнік ударыў лінейкай за тое, што забыла дома аловак. Іншых дзяцей за нявывучаныя ўрокі білі па голай спіне спецыяльна прызначанай для гэтага доўгай лінейкай. Але пакаранне дзяцей за правіны не сведчыла, што ўсе настаўнікі былі жорсткімі. У школе нас не кармілі, таму некаторыя педагогі заўсёды дзяліліся ежай з беднымі вучнямі, у якіх не было дома нават хлеба.

Бабуля ў 1947 годзе.

17 верасня 1939 года змянілася ўлада. Беднякоў яна надзялілі зямлёй, забраўшы яе ў паноў. З'ехаў у Англію пан Чарноцкі — сябар майго бацькі, а таксама іншыя ўладальнікі маёнткаў, якіх на Ляхавіччыне было не так і мала. Многія з іх пакінулі свой родны край назаўсёды. У нашай сям'і зямлю не забіралі.

Ужо ў трэцім класе я вучылася ў беларускай школе, дзе вывучалася беларуская мова, але навучанне засталося польскім, як і раней.

Мне было 11 гадоў, калі пачалася вайна. У тры гадзіны дня 22 чэрвеня 1941 года па радыё было агучана: «Увага, увага! Гаворыць Масква! Германія вераломна напала на нашу краіну»... А чацвёртай гадзіне ночы 23 чэрвеня 1941 года мы прачнуліся ад выбухаў бомбаў і свісту куль. Адразу пачалі збіраць коўдры, падушкі, ежу і панеслі ўсё гэта ў склеп (раней ён быў прызначаны для пчол, дзе яны заўсёды зімавалі). Сядзелі першыя дзесяць дзён вайны там, толькі маці выходзіла па начах (калі немцы спалі), каб падаіць кароў. Аднойчы мая малодшая сястра выйшла са склепа, і тут здарылася страшнае: ворагі яе заўважылі і паклікалі ўсю сям'ю да сябе, сказаўшы, каб мы сустракалі іх з кветкамі, стоячы ўздоўж дарогі. А калі зноў пойдзем у сховішча, то ўсіх расстраляюць. І мы стаялі, бо хацелі жыць...

Праходзілі тыдні, месяцы акупацыі, а вайна не канчалася. Аднойчы мы з маці ішлі да яе брата, які жыў непадалёку, і сустрэлі двух савецкіх салдат, што адбіліся ад сваёй разбітай часці і прабіраліся на Усход. Яны спыталі, дзе знаходзяцца немцы... У гэты дзень я ўпершыню ўбачыла, як забіваюць людзей. Літаральна за некалькі сантыметраў ад мяне праляцелі дзве кулі, якія трапілі ў гэтых хлопцаў. Для мяне было вялікім жахам убачыць раптоўную смерць людзей. Праз некалькі дзён я даведалася ад суседа, што асколкам снарада забіла ксяндза Петрашэвіча, якога вельмі паважалі ў гэтых мясцінах.

Памятаю, як немцы далі нашай сям'і палоннага, каб той дапамагаў па гаспадарцы. Звалі яго Пятром Сафтарыкавым; ён быў родам з Ташкента. Яго не забілі, як іншых палонных, бо патрэбны былі рабочыя рукі, каб апрацоўваць зямлю, нарыхтоўваць прадукты для нямецкай арміі. Прызначылі на пастой у наш дом. З намі Пятро пражыў цэлы год. За гэты час мы пасябравалі з ім. Кожны вечар, седзячы на ганку, я любіла слухаць яго аповеды пра дзяцінства, пра трагедыю сям'і (арышт бацькоў як ворагаў савецкай улады) ды пра бой 24 чэрвеня 1941 года каля ракі Шчара пад Ляхавічамі, дзе загінула столькі савецкіх воінаў і немцаў, што ўся зямля ўздоўж Брэст-Маскоўскай шашы і сама яна была заліта крывёю і ўсеяна целамі. Пражыўшы ў нас некаторы час, ён уцёк у партызаны. Пасля вайны наша сям'я атрымала ад яго ліст: «...Вось я ўжо і ў Ташкенце. З маіх родных засталася толькі бабуля, з якой я жыву. Дзякуй вам за тое, што вы для мяне зрабілі...»

...Надыходзіў 1943 год. Нягледзячы на акупацыю, мы, дзеці, хадзілі ў школу. Настаўнікам станавіўся кожны дарослы, хто ўмеў чытаць і лічыць. А потым у вёску вярнуліся немцы, якія адступалі. Яны забіралі ў жыхароў усё: ежу, адзенне, жывёлу... Старэйшых дзяцей вывозілі на работы ў Германію. У гэты спіс патрапіла і я. Але тут адбыўся цуд: у вёску прыйшлі рускія, якія выратавалі не толькі мяне, але і астатнюю моладзь.

### ПРА АЎТАРА

***Іна — удзельніца і прызёр раённых алімпіяд па беларускай мове і геаграфіі.***

***— Роднай мовай захапляюся з пачатковых класаў, — кажа 17-гадовая аўтарка. Дарэчы, яшчэ яна піша сцэнарыі для навагодніх вечароў і іншых свят.***

***Іна гаворыць, што любіць па вечарах, утульна ўладкаваўшыся на канапе, паслухаць цікавыя і пазнавальныя аповеды бабулі. Таму і на конкурс «Мы — такія!..» вырашыла напісаць сваю творчую працу менавіта пра яе.***

***Іна марыць стаць журналісткай.***

У ліпені 1943 года Ляхавіцкі раён быў вызвалены. Цяпер трэба было клапаціцца пра будучыню. У 1945 годзе я на «выдатна» скончыла школу і паступіла ў Маладзечанскі ўліково-планавы тэхнікум Белкаапсаюза на спецыяльнасць «Бухгалтарскі ўлік». Потым па накіраванні прыйшла працаваць у грамадскае харчаванне Ляхавіцкага раёна бухгалтарам. Работу сваю я вельмі любіла.

У 1956 годзе выйшла замуж за Леаніда Якубавіча Коктыша. Распісаліся ў сельсавеце ў Сваятычах, а вянчаліся ў касцёле ў Баранавічах. Паколькі мы не былі камсамольцамі, то нам гэта не забаранялася. Муж быў добрым сем'янінам. Я працавала галоўным бухгалтарам, а ён сталяром у ПМК-17. Дом у Ляхавічах пабудаваў сам. Жылі мы душа ў душу, ніколі не сварыліся, заўсёды разам хадзілі на імшу па нядзелях і ў святы, пакуль улады не забралі наш стары і прыгожы касцёл, ператварыўшы яго ў бальніцу. Але, нягледзячы на гэта, мы верылі ў Бога і ўсё роўна наведвалі касцёл ці ў Баранавічах, ці ў Мядзведзічах.

У 1984 годзе завяршылася будаўніцтва новага касцёла Найсвяцейшага Сэрца Езуса Хрыста ў нашым горадзе. Стала магчымым рэгулярна наведваць храм усёй сям'ёй. Выраслі нашы дзеці. Іх было трое. Старэйшай дачушкі Ірыны няма ўжо на гэтым свеце, як няма ўжо 8 гадоў і мужа. Дачка Ірына памерла ад хваробы на 21-м годзе жыцця. Я часта ўспамінаю яе: як пайшла ў школу, паступіла ва ўніверсітэт. Для мяне вельмі балюча гаварыць пра гэта. Пахаваць сваё дзіця — самае страшнае для маці. Вядома, дачку ўжо не вярнуць, але яна заўсёды жыве ў маім сэрцы...»

❍❍❍

Я люблю сваю бабулю не толькі за тое, што яна ёсць, але і за тое, што яна значыць для мяне, маёй маці і брата. Яна наша сонейка. Бабулі не трэба хадзіць на работу, каб зарабляць грошы. Яна пенсіянерка і займаецца нашым духоўным выхаваннем. І гэта вельмі важна для ўсіх яе чатырох унукаў. Настольнай кніжкай маёй бабулі з'яўляецца Біблія. Штодня яна шмат часу надае малітве, просячы ў Бога здароўя дзецям і ўнукам, а краіне — міру і згоды ў грамадстве. Яна нікога не асуджае, усім даруе, любіць бліжняга як саму сябе, і ў яе сэрцы заўсёды жыве любоў. Можа, па гэтай прычыне мая бабуля мае моцнае фізічнае здароўе і душэўную раўнавагу. І мы, нашчадкі, бяром з яе прыклад: як быць, як жыць, як знаходзіць выйсце з той ці іншай сітуацыі, як любіць жыццё, як быць удзячным Небу за гэты дар.

Май 1941 года, мая 11-гадовая бабуля стаіць каля свайго бацькі. Яе маці — справа, бабуля каля яе.

**Іна БУШЫЛА,**
**вучаніца**
**11 класа СШ №1**
**г. Ляхавічы.**

# ВІНЦІК З ВАЧАМІ КОЛЕРУ СВЕЖАЙ ТРАВЫ

**Кожны з нас па-рознаму пераадольвае жыццёвыя перашкоды: адных цяжкасці толькі загартоўваюць, другія саступаюць і кідаюцца ў вір адчаю і тугі. Мне, безумоўна, падабаюцца першыя. Мяне заўсёды цікавілі тыя, у каго ёсць мэта, і тыя, хто ўмее дабівацца таго, чаго хоча. Гэтыя людзі выклікаюць у мяне павагу, мне падабаецца бачыць агеньчык у іх вачах. Кожны сам выбірае свой шлях, выбірае, якім яму быць.**

У мяне ёсць цікавы знаёмы. Мы з сябрамі называем яго ласкава Вінцікам. Ён мне як брат. Мой сябар здзіўляе ўсіх і кожнага сваімі паводзінамі. Калі Вінт побач, то здаецца, што ўсё круціцца вакол яго. Яго светлая ўсмешка «а-ля 32, і гэта — не мяжа» дорыць цяпло і надзею.

Вінцік, нягледзячы на несур'ёзную мянушку і выгляд, вельмі адказны чалавек. Ён не апускае рукі ў цяжкую хвіліну і прыходзіць на дапамогу тым, каму яна патрэбна.

Напэўна, мой сябар памятае, што некалі і яму дапамаглі. Вінт нарадзіўся кволым і хворым. Маці адмовілася ад яго адразу пасля нараджэння, бо пабаялася адна гадаваць дзіця. Хлопчыка адправілі ў Дом дзіцяці. Там і пражыў ён да трох гадоў, пакуль яго не ўсынавіла адзінокая жанчына, якая не мела сваіх дзяцей. Вінцік жыў з ёю некаторы час, а потым... Потым прыёмная матуля пачала піць і спаганяць злосць на хлопчыку. Мой сябар трываў цэлы год, а потым уцёк. Вы можаце ўявіць шасцігадовага хлапчука аднаго на вуліцы позняй восенню? Бадзяючыся па вуліцах, Вінцік захварэў, трапіў у бальніцу, а потым — у дзіцячы дом. А ўжо адтуль, калі прайшло чатыры гады, у апякунскую сям'ю. На гэты раз майму сябру пашанцавала.

Пра ўсё гэта я даведалася пазней, калі пазнаёмілася з Вінцікам. А адбылося гэта будзённа: мы з сям'ёй змянілі месца жыхарства, мне давялося пайсці ў новую школу. У першы ж дзень я сутыкнулася з хлопчыкам, які мяне балюча штурхнуў, я нават калена разбіла. Калі настаўніца прывяла мяне ў клас, я проста аслупянела: за апошняй партай сядзеў той самы хлопчык-хуліган. Нас пасадзілі разам. З таго часу мы перажылі шмат сварак і прымірэнняў.

...Аднойчы Вінцік пасля ўрокаў паклікаў мяне з сабою. Мы накіраваліся ў дзіцячы дом, што побач з нашай школай. Аказалася, што хлопец часта сюды наведваецца. Мой сябар расказаў, што летам, працуючы на мойцы машын, зарабіў грошы, якія цалкам аддаў дзецям-сіротам.

Мы і раней добра ладзілі, а пасля сумеснага паходу ў дзіцячы дом сталі яшчэ бліжэй. Мы разам некалькі разоў на тыдзень наведваем малодшых выхаванцаў. А ў школе малыя непаседы не даюць нам пакою кожны перапынак. Мая матуля штодзень дзвіцца, як я магу з'есці ў школе столькі пячэння і цукерак!

А мне ўсё падабаецца. Гэта маё жыццё, гэта мой выбар, як і выбар майго сябра. Ён ёсць у кожнага: прайсці па жыццёвым шляху ценем ці, наадварот, упарта, мужна супрацьстаяць перашкодам. І ўспамінаецца тады вядомая прыпавесць пра крыж... У кожнага ён свой. І трэба памятаць, што, несучы яго, мы спазнаём радасць і шчасце перамог. Як Вінцік з вачамі колеру свежай травы.

### ПРА АЎТАРА

***Юля — з ліку самых маладых аўтараў нашага творчага конкурсу. Ёй 12 гадоў. Тым не менш дзяўчына ўжо вырашыла, што яе мара — паступіць на факультэт журналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Чаму менавіта такі выбар? Юля кажа, што ёй падабаецца пісаць, у прыватнасці, яна з задавальненнем робіць гэта для школьнай насценнай газеты. А пра наш конкурс ёй расказала настаўніца. (Герой матэрыялу, дарэчы, рэальны).***

***У вольны час дзяўчына любіць чытаць прыгодніцкую літаратуру, фантастыку, дэтэктывы і нават «жахліўчыкі». Яшчэ з 4 класа наведвае школьны гурток — вучыцца іграць на гітары. А дома дапамагае матулі гадаваць сваю малодшую сястрычку.***

**Юлія КЕДЭЛЬ, вучаніца**
**7 класа СШ №3 імя**
**В.М. Усава г. Гродна.**